Pierasyłka apłačana ryčałtam.

Nr. 20 (613). Wilnia, Niadziela 12 Traŭnia 1935 h. Hod XI (XIX).

БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i litaraturnaja hazeta.

Adras Redakcyi i Administracyi: WILNIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčyniena ad 9 hadz. ran. da 4-aj uwieč.

HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ.

Košty wydawańnia pakrywajuć składki. Składka u hod 4 zał., na paŭhoda — 2 zał., na 3 miesiacy — 1 zał.

З міжнароднай палітыкі.

У сучаснай міжнароднай палітыцы такое мітусеньне, што сапраўды трудна ўстрымацца, каб не назваць яе таўкучкай. Да таго гэтая палітыка заблытана і пamяшана, што хочачы аб ёй падзяліцца сваімі ўвагамі з нашымі чытачамі, сапраўды няведама, з чаго пачынаць. Пачнём аднак з Вэрсальскага паваеннага трактату, які фактычна й зьяўляецца родным бацькам усей гэтай блытаніны ў міжнароднай палітыцы.

Вось-жа Вэрсальскі Трактат занадта выразна падзяліў народы Эўропы на перамоўжцаў і пераможаных, на сільных і слабых, забываючыся бадай зусім на звычайную міжнародную справядлівасьць, якая й магла-б быць адзінай падставай ясных, шчырых і чэсных міжнародных адносінаў.

Праўда, пераможцы (Францыя, Англія, Італія) укладаючы Вэрсальскі Трактат, помнілі аб правох народаў нават недзяржаўных (вобак Вэрсальскага Трактату паўстаў трактат аб нацыянальных меншасьцях) і дзеля рупнасьці аб міжнароднай справядлівасьці ўстанавілі Лігу Народаў, але што-ж з таго, калі іх гэна памяць і рупнасьць была толькі на паперы, толькі на словах, і калі яны самі сябе і толькі сябе назначылі судзьдзямі дзяржаў і народаў, кіруючы адпаведна да сваей карысьці і ўсей міжнароднай палітыкай і Лігай Народаў, якая фактычна аказалася іх экспозытурай, іх выканаўчым органам.

Вось-жа стоячы на такім вузкім становішчы, карысным прадусім для перамогшых дзяржаў, Ліга Народаў хутка страціла належную ёй павагу і перастала быць аб'еднываючым цэнтрам міжнароднай палітыкі. Хутка за прыкладам Францыі, Англіі і Італіі пачалі шукаць толькі сваей карысьці так-жа і іншыя дзяржавы. Першай у гэтым была Японія. Яна, маючы на мэце стацца цэнтрам і павагай палітыкі на Далёкім Усходзе і там бачачы будучыню для сваіх інтарэсаў, з Лігі Народаў выступіла, перастала з ёй лічыцца і пачала кіравацца выключна сваей, далёкаўсходняй, японскай палітыкай.

Ліга-ж Народаў, ці вярней галоўныя дзяржавы, якія ёй кіруюць, і далей рупіліся толькі аб тым, што датыча іх, а аб іншых справах, хоцьбы як напр. справы розных недзяржаўных паднявольных народаў (так зв. нацыянальных меншасьцяў) сусім іх не абходзілі. Дайшло ўрэшце да таго, што напрыклад Польшч аб'явіла, што яна ня ліча сябе зьвязанай трактатам нац. меншасьцяў.

Відзячы аднак вялікі неспакой, як у зваяваных дзяржаваў, так і ў паднявольных недзяржаўных народаў і аберагаючы сваю скуру, тыя-ж Францыя, Англія і Італія пачалі наўзавады зброіцца.

Найбольш, як ведама, Вэрсальскім Трактатам і Лігай Народаў пакрыўджана Нямеччына. Пасьля вайны налажылі на яе вялікую контрыбуцыю, паадымалі ад яе некаторыя землі, паадымалі калёніі і забаранілі зброіцца і трымаць армію. Нямеччына, покуль чулася слабой, была паслушнай сваім пераможцам і сядзела ціха. А як пачулася крапчэй і як убачыла, што Ліга Народаў бароніць не справядлівасьці, а інтарэсаў некаторых дзяржаў і што ня ёсьць павагай, з якой трэба лічыцца, каб мець вольныя рукі ў сваей нямецкай палітыцы, за прыкладам Японіі, з Лігі так-жа выступіла.

Скарысталa з гэтага СССР. Бальшавікі, перапалохаўшыся не на жарт японскай палітыкі на Далёкім Усходзе, зразумеўшы, што ў Эўропе хоць жывецца ня лёгка, але на бальшавіцкую рэвалюцыю не заносіцца, а такжа перажываючы вялікія труднасьці эканамічныя ў нутры свайго краю, уступілі ў Лігу Народаў і пачалі шушукацца з вялікімі дзяржавамі, асабліва з Францыяй, шукаючы ў іх падтрыманьня фінансавага і палітычнага, а так-жа з свайго боку, падтрымліваючы гэныя дзяржавы ў іх палітыцы, асабліва процíўнямецкай.

Немцам гэтага стала даволі. Яны, заявіўшы, што далей паніжаць сябе дазволіць ня могуць і ня могуць чакаць, покуль на іх належна непрыгатаваных не нападзе хто, аб'явілі ў сваім краі агульную вайсковую службу і яўна пачалі зброіцца, як на сушы, так на моры і ў паветры, ня гледзячы на срогую забарону Вэрсальскага Трактату.

Сярод галоўных дзяржаў Эўропы, а так-жа і ў СССР паўстаў гвалт. Экстэрна была склікана Ліга Народаў, якая нямецкую работу зганіла і пастанавіла абдумаць спосабы, як з падобнымі выступленьнямі бароцца. А немцы на гэта адказалі вострым пратэстам, заяўляючы, што Ліга ня мае ніякага права мяшацца ў нямецкія ўнутраныя справы.

Што-ж цяпер будзе, можа вайна? На нашу думку вайны покульшто ня будзе. Нямеччына, ад якой вайна прадусім залежа, яшчэ не сусім прыгатавана. Узноў-жа Японія, ад якой так-жа вайна можа пачацца, таксама не выглядае, каб вайну ў хуткім часе пачала, тым больш, што савецкая палітыка да Японіі цяпер даволі мяккая і японцы з яе і без вайны пакрысе карыстаюць і будуць карыстаць далей. Агулам-жа трэба сказаць, што хоць бадай усе дзяржавы да вайны рыхтуюцца, але вайны баяцца, як сьмерці, і ня лёгка ім яе пачаць ці ў пачатую ўцягнуцца. І гэта зразумела. Вайна ў нашым часе магла-б прынесьці дзяржавам такія не спадзеўкі, аб якіх ім і ня сьніцца.

Вось-жа покульшто не вайна паўстане ў Эўропе, а вялікія палітычныя саюзы дзяржаў, над стварэньнем якіх эўропэйскія палітыкі цяпер працуюць і якіх мэтай будзе ўтрымаць супакой. Асяродкі такіх саюзаў ужо зарысаваліся ясна: Францыя і СССР з аднаго боку, а Нямеччына й Польшч з другога. Хто да этых асяродкаў пачне далучацца — хутка ўбачым.

Нам-жа беларусам астаецца народна-культурная й палітычная праца і яшчэ раз праца, каб справа беларускага народу сталася ўрэшце справай міжнароднай справядлівасьці.

Krychu z polskaj haspadarčaj palityki ŭ našym Kraju.

Naša kraina — zachodnie-biełaruskija i ŭschodnie litoŭskija ziemli — nahłucha admiežawanaja ad dziaržaŭnaj Litwy, Łatwii, całaha ŭschodu i ciesna źwiazana palityčna, a razam z hetym i haspadarča-ekanamična z Polščaj.

Haspadarčaje žyćcio ŭ našym Kraju niezajzdrosnaje. Žyćcio ziemlarobaŭ wielmi ciažkoje. Pryčyny hetaha wypływajuć nia tolki z haspadarčaha kryzisu, na jaki hetak mocna ŭsie narakajuć, ale tak-ža z biezziamiella i małaziamiella sialanstwa, wialikich padatkaŭ — dziaržaŭnych i samaŭradawych — roznych šarawarkaŭ (padatak u natury) i abiazcenki ziemlarobskaj pradukcyi.

Da ŭsiaho hetaha jašče dadajecca i wypadkowaje zacikaŭleńnie, abo zusim „niezacikaŭleńnie" našym krajem polskaj haspadarčaj palitykaj.

Zawiedziena addoŭžańnie sialanskich haspadarak. Chto ŭ našym Kraju z hetaha „dabradziejstwa" skarystaŭ? —Najbolš polskija asadniki. Ab hetym my ŭ swoj čas pisali. Biełaruskaje i litoŭskaje sialanstwa ab hetych addoŭžańniach tolki čuła. Praŭdu kažučy, dyk našaje sialanstwa, aprača padatkowych, prywatnych i ŭ „Kasie Stefčyka,"inšych daŭhoŭ nia maje, bo jamu z inšych žarоł ciažka było i ŭ lepšyja haspadarčyja časy dastać pazyku.

Ab polskaj haspadarčaj palitycy ŭ našym Kraju pišuć i polskija hazety, zrazumieła, što łahodnieńka, ale i hetym dajuć šmat świadła na polskaje ŭ nas haspadarawańnie.

„Kurjer Wilenski" (Nr 101—1935) ŭ hetaj sprawie, miž inšym, piša: — „U paraŭnańni da traciny polskaj dziaržawy pałožanaj na ŭschod ad raki Buh (naš Kraj — red.), nia tolki Šlonsk, Paznanščyna ci Waršawa, ale i ŭsie inšyja časci dziaržaŭnaj terytoryi značna prainwestawanyja" (inwestycyja — wydatki hramadzkich abo dziaržaŭnych hrošaj na ahulna-haspadarčyja patreby, jak budowa daroh, rehulacyja rekaŭ i h. p.).

Hety samy „Kur. Wil." dalej piša, što z dziaržaŭnaha kapitału „Fondu Pracy" (kapitał dziela baraćby z biezraboćciem) na 1935—36 hod wydana na inwestycyju zachodnim wajawodztwam polskaj dziaržawy niekalki razoŭ bolš, čymsia wajawodztwam uschodnim — (naš Kraj). „Nam patrebnyja šosy, patrebnyja čyhunki, patrebnyja wodnyja šlachi, a heta ŭsio budujecca tam, dzie šmat mienš patrebnyja, čymsia ŭ nas" — narakaje i žalicca „Kur. Wil."

Praŭda, tam u Polščy mnoha biezrabotnych i treba im dać pracu. Ale-ž hetkich biezrabotnych nia mienš i ŭ našym Kraju —biezrabotnymi pierapoŭnieny wioski i sioły, dzie nijakaja statystyka ich nie zapiswaje.

Dyk čamuž nia turbujecca „Fond Pracy" ab hetych biezrabotnych? Našyja biezrabotnyja ŭmiejuć rabić i lubiać pracu; kali jany patraplajuć budawać darohi i papraŭlać masty šarawarkami, dyk za zapłatu lepš zrobiać.

Niadaŭna zawiedzienaja dziaržaŭnaja inwestycyjnaja pazyčka ŭ Polščy, ab jakoj my ŭžo pisali, wyzwała cikawyja zaŭwahi ŭ „Kur. Wil." (Nr 103—1935), jakija tak-ža ilustrujuć polskuju haspadarčuju palityku ŭ našym Kraju. Tam skazana hetak:

„...Reklamowyja abwiestki, zaklikajučyja da padpiski na pazyčku, abiacajuć, aprača premii i procantu, šmat inwestycyjaŭ, a ŭ pieršaj čarzie „regulacyja Wisły." Dalej čytajem nastupnaje: „Wisła wyliwajecca raz u sto hadoŭ. a ŭschodnija ziemli (naš Kraj—red.)ŭpadajuć z dnia na dzień—zamirajuć, wianuć i korčacca. Asablíwa zaniadbana naša Wilenščyna, jakaja wysuniena na poŭnač pahardna abazwana „polskim Sibiram."

A woś i nowaja wiaśnianaja krasačka na naš paletak.

U naš Kraj prywoziać z Polščy žyta, jakoje buduć razdawać na adrabotak na rabotach prawodžanych koštam inwestycyjaŭ. Žyta henaje prywoziać u naš Kraj z Pramysłowa-Zbažowych Dziaržaŭnych Mahazynaŭ, jakija zbožža ŭ našym kraju jašče nia skupliwali. Zbožža z hetych mahazynaŭ užo pajawiłasia ŭ wialikaj kolkaści ŭ Wilenščynie i ŭ Nawahradčynie. Ab hetym niezdawolena pišuć i polskija hazety našaha Kraju — „Słowo" i „Kurjer Wilenski."

Zrazumiełaja reč, što tutejšaje žyta musić lažać u świrnach haspadaroŭ, pakul nie ŭpatrebicca polskaje mahazynowaje žyta. Urezultacie — i bahaciejšy ziemlarob biadnieje, bo nia maje rynku zbytu dla swajho zbožža. A padatki —dziaržaŭnyja, samaŭradawyja i darožnyja —płacić treba.

Woś tut i žywi... woś i raźwiwajsia... *j. p.*

Dr. St. Hrynkiewič.

Narodnyja Uniwersytety ŭ Danii.

(Praciah, hl. „Bieł. Kr." Nr. 19).

Zhodna z teoretyčnymi asnowami Grundtviga centram pracy budzie na ŭniwersytecie historyja baćkaŭščyny, historyja suświetnaja i historyja kultury, rodnaja mowa. Pradmiety henyja miecimuć inšy krychu charaktar, čymsia prywykli my da ich u aficyjalnaj škole. Prykładam, u rodnaj mowie nacisk budzie nie na hramatyku i suchija prawiły, a na teksty najwydatniejšych paetaŭ i piśmieńnikaŭ. U historyi hutarka nie ab faktach chronolohičnych, a ab asnaŭnych kirunkach. Kali prelehent spyniajecca nad paasobnymi adzinkami wydatniejšymi, dyk nia dziela taho, što wyjhrali jany ci prajhrali niejkija wojny, ale henyja adzinki nastolki buduć ważnymi, naskolki dziakujučy im byŭ zrealizowany postup čaławiectwa ŭ halinie kultury i cywilizacyi.

Wučni prywykajuć šukać samastojna wiechaŭ na asnaŭnych šlachoch narodaŭ. Imknieńnie prelehenta i supracoŭnictwa kursantaŭ idzie ŭ tym kirunku, kab kožny kursant pierażyŭ paswojmu ŭsie minuŭšyja padziei, kab nia było ničoha niedahaworanaha ŭ niwodnym kirunku.

Meta prelekcyjaŭ, jak kaža adzin z polskich aŭtaraŭ, jaki zajmajecca Nar. Uniw. (Świeżynski), uzhadawać wučniaŭ tak, kab im było dobra z ludźmi, a ludziam z imi, dyk temy zaŭsiody abhaworywajuć sužyćcio ludziej, narodaŭ z boku hledžańnia etyki.

Ciažka pawieryć, kolki ŭzhadawaŭčaha i adnačasna dynamičnaha nastroju ŭ hetkaj formie nawučańnia. Asabista nia moh ja nadziwicca, adwiedywajučy adzin z hetkich kursaŭ žanočych. Takija sabie „štodziennyja" wiaskowyja dziaŭčaty pašla troch miesiacaŭ pracy nad saboju byli adzinkami, jakija nadta padčyrkiwali swaju wiaskowaść, sialanskaść swajeju wopratkaju, manierami, sposabam hutarki, adnak heta byli ludzi ŭ poŭnym sensie hetaha słowa, ludzi, u jakich astałosia ŭsio, što było dobraha, a jakija zdabyli pobač hetaha ŭsie swomaści kulturnaha čaławieka.

Praca na kursie nie kančajecca prelekcyjami, sprečki i hutarki wiaduć kursanty pamiž saboju i dalej. Kursanty naładžywajuć u swajoj hramadzie tawaryskija ci hramadzkija arhanizacyi, prywykajučy hetkim čynam da hramadzkich formaŭ žyćcia.

Niama niwodnaje haliny žyćcia, jakaja-b była im čužoju. Z formaŭ mastactwa, asabliwa ŭ polskich uniwersytetaŭ u Šycach, zrobleny wialiki nacisk na teatr, dziela abraznaha dziejańnia teatru i mahutnaha dziejańnia ŭzhadawaŭčaha.

Praca na ŭniwersytetach trywaje kala 5 miesiacaŭ (ad listapada da krasawika). Uletku idzie žanočy kurs cieraz try miesiacy (ad traŭnia da wierašnia). Kursy płatnyja miesiačna kala 80 karonaŭ (adna karona kaštuje 2 zł. 40 hrašej). Na polskich uniwersytetach płata bolš mienš takaja samaja, chacia wialikaja častka kursantaŭ mieła stypendyi samaŭradawyja, ad arhanizacyjaŭ kulturna-aświetnych i palityčnych.

U Danii dzicia rychtujecca da ŭniwersytetu ad samych rańnich hadoŭ i abo baćki dajuć hrošy na nawuku, abo chłapiec ci dziaŭčyna jedzie za swaje sobskija. Zarabić henyja hrošy zaŭsiody paśpieje ŭ suwiezi z tym, što na ŭniwersytet dziela roznych miarkawańniaŭ nia prymajecca maładziejšych, jak 16 ci 18 hadoŭ. Siaredni wiek nahladajecca pamiž wučniami kala 20—24 hadoŭ, chacia bywajuć i 35 hadowyja ludzi.

Kab była praciažnaść pracy, byŭšyja haduncy arhanizujuć pamiž saboju sajuz. Uniwersytet— heta „škoła žyćcia", hdzie-b wučylisia ŭsie nia dziela paświedčańnia, dyplomu, a kab skarystaŭšy ŭ praciahu niekalki miesiacaŭ wiaści dalej pracu ŭ chacie, na wioscy, pamiž swaimi. Realizujuć u žyćci namiečanyja supolna plany, dziela hetaha trymajuć kantakt, sabirajucca z hodu ŭ hod, kab padrachawać zdabyčy, kab pasłuchać, što robić kožny, kab wiaści ŭsim supolna prawilnuju liniju.

Narodny Uniwersytet nie zajmajecca palitykaju, palityčnymi partyjami, chacia biazumoŭna kožny ŭčaśnik moža mieć i maje swaje palityčnyja ci hramadzkija idei. Heta nia tolki nie zaminaje ŭ pracy, a naadwarot, pamahaje, — ludzi wučacca razumieć dumki druhich, umiejuć lepš acanić sobskuju prahramu.

Na kaniec adno pytańnie. Mohuć źjawicca sumliwy, ci takaja „škoła" nie zmarnuje čaławieka, ci nia wykliča jana ŭ jaho nierealnych ambicyjaŭ, ci nie adarwie ad žyćcia i nie raściarušyć?...

Na heta možna na asnowiedzi praktyki danskich uniwersytetaŭ dać zusim stanoŭki adkaz. Nastroj, atmasfera na ŭniwersytetach uzhadowywaje dobrych hramadzian, dobrych synoŭ swaje baćkaŭščyny, jakija wielmi chutka zajmajuć pieršaje miesca ŭwa ŭsich płoščach dziejnaści.

Гурткі Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры!
Ці вы ўжо ўпарадкавалі свае бібліятэкі?
Ці папоўнілі іх новымі кнігамі?
Ці сабралі кніжкі ад прыяцеляў і знаёмых?
Ці зрабілі шафкі на кніжкі?

Biełaruskaja sanacyja pahłybiaje padzieł u Biełaruskim narodzie.

Chto čytaje sanacyjnuju polska-biełaruskuju hazecinu „Родны Край", toj moh lohka zaŭważyć, što „białorusini-polacy" až sa skury lezuć, kab pahłybić padzieł u Biełaruskim narodzie pamiž prawasłaŭnymi i katalikami. Jany badaj u kožnym numary pišuć, što jany, h. zn. „białorusini-polacy", prawasłašnyja, a „chadeki" kataliki, što jany iduć u prawasłaŭnyja masy (nichto ich nia prymaje!), a „chadeki" ŭ katalickija. My ŭžo niaraz pisali ab tym, što naša hrupa jość ahulna-biełaruskaj i składajecca z prawasłaŭnych i katalikoŭ i što my ŭ adradženskaj pracy nia robim nijakaj rožnicy pamiž katalikom i prawasłaŭnym, i što kličam usich biełarusaŭ da supolnaj pracy nad adbudowaj swajej Baćkaŭščyny. My tak-ža niaraz zajaŭlali, što jednaść Biełaruskaha narodu, jak nacyi, — *heta naša hałoŭnaja palityčnaja linija,* ad jakoj my nie adstupim nikoli ŭ imia dabra hetaha narodu. Adnak „naša" sanacyja ŭściaž padymaje źwiahu i namahajecca zahnać relihijny klin pamiž paswaranymi častkami našaha harotnaha narodu. Z hetaha widać, što sanatary majuć taki zahad i pastupajuć planowa „wedle rozkazu".

Dahetul pahłybleńniem padziełu pamiž Biełaruskim narodam zajmalisia polskija ksiandzy i maskoŭskija papy, adny ciahnuli ŭ Waršawu (polskaja wiera), a druhija ŭ Maskwu (ruskaja wiara), ciapier-ža na padmohu im pryjšła bieł. sanacyja i robić dalej hetu pahanuju rabotu. Ale naš narod užo paznaŭsia na hetych „działaczach", naležna ich acaniŭ i ŭ rezultacie adwiarnuŭsia ad ich. Dokazam hetaha jość fakt, što na staronkach „Краю" niama aniwodnaj karespandencyi, aniwodnaha piśma z wioski. Da nas pišuć i prawasłaŭnyja i kataliki, a ŭ „P. Край" nichto – ani katalik, ani prawasłaŭny. Widać, usie świedamyja biełarusy paznalisia na „malawanych lisach" i my wierym, što heta pahanaja rabota, za jakuju ŭziałasia bieł. sanacyja za srebnik zrabić,— kab adzin biełaruski narod padzialić na dwa narody,—joj nia ŭdasca. My wierym, što Biełaruski narod astaniecca nacyjanalna zaŭsiody adzinym. Bo swaračysia pamiž saboju, naš narod budzie asłablać swaje siły, a hetaha jakraz treba tolki našym woraham. A asłabiŭšy swaje siły, narod nia tak skora dojdzie da pažadanych metaŭ. Dziela hetaha nie ŭ relihijnaj swarcy, a ŭ poŭnym supracoŭnictwie katalikoŭ i prawasłaŭnych na biełaruskim nacyjanalnym hruncie my bačym palityčnaje i narodnaje adradžeńnie našaj nacyi. Katalik niachaj budzie katalikom, ale niachaj pracuje dla Biełarusi, prawasłaŭny niachaj budzie prawasłaŭnym i niachaj taksama pracuje dla Biełarusi — woś naša ideja. Złučanyja siły macniej za raździelenyja. Dziela hetaha my nie razumiejem biełaruskaj palityčnaj partyi, jakaja była-b tolki prawasłaŭnaj: *jana pawinna być ahulna-biełaruskaj.* Relihijny padzieł moža być tolki ŭ relihijnych sprawach, ale ŭ narodna-palityčnych pawinna być jednaść i supracoŭnictwa dźwuch wialikich halin Biełaruskaha narodu: i prawasłaŭnych i katalikoŭ. U hetym supracoŭnictwie my bačym załoh lepšaj budučyni našaha narodu.

Hetak razumiejem my i hetak razumiejuć tyja kataliki i prawasłaŭnyja, jakija hurtujucca kala Biełaruskaha Nacyjanalnaha Kamitetu. *K. L.*

Z žyćcia litoŭskaj himnazii ŭ Świancianach.

„Viln. Rytojus" z dnia 8.V. siol. h. pad zahałoŭkam: „Wučniam Świancianskaj himnazii nie pazwalajuć zdawać maturalny ekzamien u litoŭskaj mowie" pamiaściła nastupnyja ŭwahi: „Wučni wośmaj klasy Świancianskaj litoŭskaj himnazii dahetul maturalny ekzamien zdawali razam z wučniami himnazii Witaŭta Wialikaha ŭ Wilni. U abiedźwioch himnazijach wykładowaj mowaj jość litoŭskaja, dyk i maturalny ekzamien wučni zdawali palitoŭsku. Ciapier my dawiedwajemsia, što Wilenskaja Školnaja Kuratoryja, jakaja arhanizuje ekzamienacyjnyja kamisii, pawiedamiła Świancianskuju himnaziju, što sioleta wučniam hetaj himnazii nie pazwalajecca zdawać maturalny ekzamien prad tej kamisijaj, jakaja budzie ekzamienawać wučniaŭ Wilenskaj himnazii. Pryčyna takoha šahu Kuratoryi, jak udałosia śćwierdzić u Kuratoryi, — našaha hramadzianstwa i henaj himnazii byccam nielojalnaść.

Dyrekcyja Świancianskaj himnazii robić usio mahčymaje, kab Wilenskaj Kuratoryjaj hetaje rasparadžeńnie było adkliknuta".

Słowam, nia tolki sumna na školnym froncie biełaruskim, ale tak-ža i litoŭskim. Adnak niama taho złoha, kab nia wyšła na dobraje. Ciažkoje pałažeńnie rodnaj aświety biełarusaŭ i litoŭcaŭ pawinna pabudzić hetyja narody da bolšaj tworčaj narodnaj pracy i dawieści ŭrešcie da pieramohi. *P. Ł.*

БЕЛАРУСЫ! Падтрымлівайце сваю прэсу. Выпісвайце найстарэйшую беларускую газэту „Беларускую Крыніцу!"

Wincuk Adważny. 36)

Chłapiec.

POWIEŚĆ.

X. Wialikaja palityka. (*Praciah*).

Tymčasam Wincuś nazaŭtra sabraŭsia z ducham i z manatkami i pajšoŭ piechatoju ŭ Zawałaku.

Byŭ kaniec miesiaca listapada. Poznaja wosień u hetym hodzie wielmi zaciahnułasia; jašče nia było ni śniehu, ni marozu: stajała niahodnaja pahoda — ściudziony wilhotny wiecier, nizka paŭzučyja chmary, imhlisty tuman i doždž nawodzili nudu na dušu, a prastudu na cieła. Adnak apošnija dni listapada byli lepšyja: chmary padnialisia wyšej, doždž pierastaŭ, a nawiet stała pakazywacca sonca—niejkaje biednaje sonca— biez naležnaha ciapła i świetu, ale ŭsiožtyki kryšku wiesialej zrabiłasia na świecie.

Wincuś išoŭ piechatoju. Bakami darohi byli pratoptany ściežki; tam było sušej. A samy haściniec byŭ tak rastaptany i raźmiešany, što biednyja koniki ledź-nia-ledź wyciahiwali nohi z razkisšaha bałota. Wincuś nahnaŭ i minuŭ nieskalki furmanak; narešcie zraŭniaŭsia sa znajomym bałahołam, Lejbam Rudkiesam, katory pastajanna miasiŭ bałota pamiž Murawankaj i Zawałakaj. U Murawanku jon waziŭ cialaty, jajki, masła, woŭnu, cybulu i pryhodnych pasažyraŭ, a nazad waziŭ kramnyja tawary i taksama pasažyraŭ. Lejba zarablaŭ nadta mała, ale zatoje zaŭsiody byŭ u darozie, a z hetych hrašoŭ i kapiejak karmiŭ žonku i siamiora dziaciej. Ciapier Lejba wioz u Zawałaku bočku sieladcoŭ, dwa pudy myła, niekalki skrynak ćwiakoŭ i inšych drobnych tawaraŭ; apryč taho siadzieła ŭ jaho pad budoju piaciora baradatych žydoŭ, katoryja hołasna i šybka harhatali ab swaich handlowych intaresach. I naahuł Lejba waziŭ usich pasažyraŭ, jakija papadalisia, i za ŭsiakuju canu, jakuju ŭdałosia wytarhawać; choć niby taksa była adwiečnaja z Murawanki ŭ Zawałaku dwaccać kapiejak, ale chto tam hladzieŭ toj taksy! Lejba ŭsich pchaŭ u budu, chto tolki padlez pad ruku, a z canoj niejak pośle sychodzilisia. Tawary Lejba taksama waziŭ usialakija, tolki nia lubiŭ wazić karasiny i žaleza.

— Niachaj jaje chalera woźmie, hetuju karasinu! Jak ja byŭ małady, — raskazywaŭ Lejba, — dyk ja waziŭ i karasinu, ale adzin raz, jak zaharełasia hetaja karasina ad papiarosy (a chwaroba jaje wiedaje, jak jana tam zaharełasia!), dyk zhareŭ mnie cely woz z tawaram, i čuć nie zhareŭ koń i ŭsie maje pasažyry. Uj, jaki byŭ strach i kryk! mnie samomu celaja barada zhareła. A karasiny była tolki niewialikaja banka. Uj, a kab była celaja bočka, što było-b tady? Z toj pary ja bolš karasiny nie wažu. A žaleza nie wažu taksama, bo jano wielmi ciažkoje: zarabotak mały, a celuju darohu žaleza braždžyć i wušy adbiwaje. Uj!

Žyćcio Lejby było nadta ciažkoje: jon zaŭsiody dumaŭ i pieradumywaŭ, jak zarabić na kusok chleba; z hetych dumak jon biez pary pasiwieŭ i pałysieŭ. Nia majučy ŭ darozie z kim padzialicca dumkaj (bo Lejba redka siadaŭ na woz, a zaŭsiody jšoŭ piechatoju bakawoj ściažynkaj), jon prywyk hawaryć sam z saboju: i nia tolki hawaryŭ taksabie — biez patreby i wyniku, — nie, jon z saboj radziŭsia, stawiŭ sabie pytańni i adkazywaŭ, nawiet śmiejaŭsia, zławaŭsia, stydziŭ siabie, abo spračaŭsia z saboju.

Woś i ciapier Lejba jšoŭ bokam haścinca i ad pary da pary cmokaŭ na kania i šlohaŭ na strach kaniu puhaj pa pawietry. Ale koń nie źwiartaŭ uwahi na hetuju puhu, bo—raz što Lejba byŭ daloka, dyk nia było čaho bajacca, a druhoje—što koń užo da hetaj puhi prywyk. Kaliści, jak byŭ małady, dyk tahdy krychu bajaŭsia, i kožny raz, jak Lejba šlohaŭ puhaj, dyk koń uchmylaŭsia i šlohaŭ chwastom, ale heta było daŭno... Hadoŭ?... Nie, nie skažu, skolki hadoŭ! bo wy nie zachočycie moža jaho ŭ Lejby kupić, a Lejba ŭžo hadoŭ piać kaža: „majmu łysamu moža dwanaccać hadoŭ budzie, a moža i nia budzie?"

Adziety byŭ Lejba ŭ doŭhi, abłatany jznoŭ parwany bałachon, koleru taho samaha bałota, što było na haścincy. I naahuł skazać, Lejba tak byŭ zwykšysia i zrozšysia z hetym bałocistym haścincam, jak toj prydarožny kamień, z katoraha wiecier, doždž i bałota źniali jahonuju kamiennuju naturu i nałažyli swaju, tak što jon staŭ bałotnaj hrudaj. Abmazany šerym bałotam—ad šapki, barady i chałata — da swaich doŭhich pamorščanych botaŭ, — Lejba moh sprawiadliwa nazywacca bałotnym carom. Adna pała chałata była zatkniona za pojas, dyk spadyspodu wyhladali abšmalcawanyja bałotam portki i bałtalisia kasmylki ad cyceła. Na twary Lejba byŭ naskroś abrozšy wałasami, pejsami, wusami i baradoj: z žywoha cieła tolki styrčeŭ z pamiž wałasoŭ nos, ale i toj byŭ papeckany bałotam; a z pad machnataj šapki i z pad hustych browaŭ ledź-ledź praświečywali ciomnyja wočy, katoryja adnakža wypaŭniali swoj abawiazak biaz pryhany.

Adzin z charakternych dakumantaŭ.

U ciažkich warunkach pracuje Biełaruski Instytut Haspadarki i Kultury — adnosiny z boku administracyjnaj ułady da dziejnaści Instytutu nie „zajzdrosnyja“. A ŭ Nawahradčynie hetyja adnosiny, dyk prosta zusim niemahčymyja. Warunki pracy Instytutu ilustruje i hety woś dakumant:

Biełaruski Instytut
Haspadarki i Kultury. Kopija.
Nr. 468
6.V.35 h.

PANU
NAWAHRADZKAMU WAJAWODZIE
ŭ Nawahradku

P. Nawahradzki Starasta pry zakładańni hurtkoŭ Biełaruskaha Instytutu Haspadarki i Kultury ŭ Delatyčach (wierasień 1934 h.), Mondzinie i Wiarašyčach (studzień 1935 h.) wymahaŭ ad zakładčykaŭ uniasieńnia stemplowaj apłaty. Hetaja apłata była ŭniesiena zakładčykami hurtkoŭ u Mondzinie i Wiarašyčach. Dawiedaŭšysia ab hetym, Centrala Instytutu wysłała da P. Starasty ŭ Nawahradku papieru takoha źmiestu:

„Ad zakładčykaŭ niezarejestrawanych hurtkoŭ Bieł. Instytutu H. i Kultury Centrala Instytutu atrymała wiestku, što Pan Starasta dziela rejestracyi henych hurtkoŭ (Delatyčy, Mondzin, Wiarašyčy) wymahaŭ stemplowych apłataŭ. Źwiartajemsia da Pana Starasty z wietliwaj prośbaj pawiedamić nas, na jakoj padstawie Pan Starasta stawiŭ wymahańni ŭ sprawie stemplowych apłataŭ pry rejestracyi wyšej-aznačanych hurtkoŭ Instytutu?“

Papiera heta była wysłana 15.III. 1935 h. Pračakaŭšy na adkaz 4 tydni i nie atrymaŭšy jaho, Centrala Instytutu dnia 11.IV. s. h. wysłała druhuju papieru takoha źmiestu:

„Prosim paśpiašyć z adkazam na našu papieru z dn. 15.III. s. h. Nr. 445 u sprawie wymahańnia ad zakładčykaŭ hurtkoŭ Instytutu ŭ Delatyčach, Mondzinie i Wiarašyčach stemplowaj apłaty pry rejestracyi hetych hurtkoŭ“.

Adnak i na hetu papieru da siańniašniaha dnia Instytut nie atrymaŭ nijakaha adkazu, choć užo šmat času prajšło ad wysyłki našych papieraŭ i ad wydańnia cyrkularu P. Ministram Unutranych Spraŭ, kab nie rabić nijakich trudnaściaŭ i ździekaŭ (szykan) hramadzianam, jakija zwaročwajucca da administracyjnych uładaŭ u PolšČy. Dyk ciapier zwaročwajemsia praz Pana Wajawodu da P. Nawahradzkaha Starasty z zapytańniem, na jakoj praŭnaj padstawie jon wymahaŭ ad zakładčykaŭ wyšej-aznačanych hurtkoŭ stemplowych apłataŭ pry rejestracyi ich? Razam z hetym wietliwa prosim Pana Wajawodu pawiedamić nas ab rezultacie rekursaŭ, jakija padali Panu Wajawodzie zakładčyki hurtkoŭ Instytutu ŭ Delatyčach i Mondzinie praciŭ pastanowy niezarejestrawańnia ich P. Nawahradzkim Starastaj?

(—) *J. Malecki*
za Sekratara.

(—) *Ks. W. Hadleŭski*
Staršynia BIHiK.

Prajekt wybarnaj ordynacyi ŭ Sojm i Senat.

U minułym tydni konstytucyjnyja senackaja i sojmawaja hrupy Klubu Be-Be wypracawali akančalna prajekt nowaj wybarnaj ordynacyi ŭ Sojm i Senat. Pawodle hetaha prajektu Sojm budzie składacca z 200 pasłoŭ (dasiul 444); prawa wybaru majuć usie hramadzianie, biaz rožnicy płoci, što skončyli — pierad dniom abwieščańnia ab wybarach — 24 hady; prawa być wybranym — majuć usie, chto pierad abwieščańniem ab wybarach skončyŭ 30 hadoŭ; wybary adbywajucca ŭ niadzielu, čas wybaraŭ—ad dnia abwieščańnia da dnia hałasawańnia—trywać budzie nia mienš 54 i nia bolš 60 dzion; prawodzić wybary buduć: hieneralny wybarny kamisar, akružnyja i abwadowyja wybarnyja kamisii; usia dziaržawa dzielicca na 100 wybarnych wokruhaŭ; kožny wokruh budzie mieć 2-ch kandydataŭ u pasły; śpisak kandydataŭ na pasłoŭ a tak ža śpisak zastupnikaŭ hetych kandydataŭ budzie ŭstanaŭlać u kožnym wokruhu akružnoje sabrańnie, jakoje składajecca z delehataŭ: a) terytoryjalnaha samaŭradu (pawietawych, wałasnych i wiaskowych radaŭ), b) haspadarčaha samaŭradu i fachowych arhanizacyjaŭ (pramysłowa-handlowych, ziemlarobskich (rolniczych), ramieślenych pałataŭ, uradaŭ profesijanalnych sajuzaŭ) i — kali wokruh budzie mieć bolš jak 100.000 žycharoŭ — profesijanalnaha samaŭradu (lekarskich, adwakackich, notaryjalnych pałataŭ), a tak ža, u wokruzie, hdzie znachodzicca wyšejšaja škoła, — delehataŭ hetaj škoły; kožny kandydat moža kandydawać tolki ŭ adnym wokruhu; mandaty atrymliwajuć tyja z kandydataŭ, što ŭ wyniku hałasawańnia atrymajuć najbolš hałasoŭ.

Pawodle prajektu Senat budzie składacca z 96 senataraŭ, z hetaha liku — $1/3$ (32 senataraŭ) wyznačaje prezydent, a $2/3$ (64 senataraŭ) wybirajuć wajawodzkija wybarnyja kalehii, jakija składajucca z delehataŭ ad hramadzian, što majuć prawa wybaru ŭ Senat — dziela asabistych zasłuh abo dziela dawieru da ich sa starany hramadzian; prawa wybaru dajecca tym, što skončyli 30 hadoŭ, a prawa być wybranym tym, što majuć prawa wybaru ŭ Sojm i što skončyli — pierad dniom abwieščańnia ab wybarach — 40 hadoŭ; kandydawać možna tolki ŭ adnym wajawodztwie. Pawiet dzielicca na wybarnyja abwody, što naličajuć pa 60 wybarščykaŭ u Senat; kožny taki abwod wybiraje adnaho delehata ŭ wajawodzkuju wybarnuju kalehiju; hetaja kalehija ŭstanaŭlaje śpisak kandydataŭ i hałasuje, a ŭ wyniku hałasawańnia astajucca wybranymi na senataraŭ tyja kandydaty, što atrymajuć najbolšy lik hałasoŭ, adnak-ža nia mienš ad $1/3$ hałasoŭ kožny; pa wybarach senataraŭ adbywajucca takim-ža sposabam wybary dwuch zastupnikaŭ senataraŭ; prajekt ustanaŭlaje nieadnolkawy lik senataraŭ u kožnym wajawodztwie.

Takim čynam, jak bačym, prajekt nowaj wybarnaj ordynacyi kasuje pryncyp biezpasrednych wybaraŭ u Senat, uwodziačy wybary ŭ Senat dwuchstupianiowyja, a tak-ža ahraničajučy hety pryncyp pry wybarach u Sojm, nie dajučy prawa samym wybarščykam ustanaŭlać śpiski kandydataŭ u Sojm.

Prajekt budzie addany dziela pryniaćcia parlamantu, jaki sklikajecca dziela hetaj mety, jak padajuć hazety, u kancy hetaha miesiaca.

M. Z.

БЕЛАРУСКАЯ ХРОНІКА.

Барацьба беларусаў з бальшавікамі. Ня так даўно ўцёк з Саветаў б. сябра Ц.К. Грамады Л. Мэнкэ, які праз 5 гадоў займаў у бальшавікоў даволі высокае становішча. Л. Мэнкэ цяпер прабывае ў Вільні і расказывае аб бальшавікох цікавыя для нас навіны. Між іншым даведываемся, што нядаўна ў Сав. Беларусі бальшавікі выкрылі аж 360 беларускіх тайных ячэек нацыянальнай арганізацыі, якая імкнецца зваліць бальшавізм і стварыць незалежную Беларусь. Пры гэтым даведываемся, што беларусы боруцца з камуністамі і аружжам —страляюць бальшавіцкіх палітрукоў і падобных камуністычных прыганятых; страляюць спадцішка. І гэта не выпадковыя здарэньні, а пастаянныя, якія маюць безпрарыўную цягласьць.

Гэта сапраўдная вайна падбітага народу з заваявацелям — гэта цяглае паўстаньне беларусаў супроць маскоўскага бальшавізму!

Пісьмо Б. Тарашкевіча з падрастрэлу. Зімой разышлася вестка, што бальшавікі растралялі Б. Тарашкевіча. Тымчасам Б. Тарашкевіч пакульшто жыве, славіць Маскву, б'е паклоны Сталіну, расхвалівае бальшавікоў і ганіць Рака-Міхайлоўскага, Мятлу і іншых сяброў Грамады, з якімі тут, у Зах. Беларусі, служыў чырвонаму Крэмлю.

Б. Тарашкевіч нядаўна апублікаваў у камуністычных газэтах адкрытае пісьмо, у якім публічна заяўляе, што яго бацькаўшчына не адна Беларусь, але ўся вялікая непадзельная Расея, і што ён сваю бацькаўшчыну — „недѣлимую Россію“ будзе бараніць з усіх сіл, а каб умець бараніць, дык паступіў у расейскія „стшэльцы“ — „ворошыловские стрелки.“

Вось на чым палягала і дзе кончылася „вялікая“ дзейнасьць павадыра Бел. Сял. Раб. Грамады.

Беларускія ксяндзы пад судом. Кс. В. Гадлеўскі, старшыня Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры, і кс. Я. Семашкевіч атрымалі з пракуратуры акт абвінавачаньня. Пракуратура абвіняе ксяндзоў Гадлеўскага і Семашкевіча за выданьне кніжыцы беларускіх баек і вершаў „На покуці“ (сканфіскаваная), у якіх адміністрацыя з пракуратурай угледзілі абразу палякоў і такія весткі, што могуць вызваць „непокуй публічны.“ Пры гэтым трэба сказаць, што сканфіскаваныя байкі і вершы, апрача аднае, усе ўжо друкаваныя ў часапісах і тады ня былі канфіскаваныя. Справу будзе разглядаць Акружны Суд у Вільні.

Жалобнае набажэнства. У панядзелак 6 г. м. у 9 тую гадаўшчыну сьмерці К. Сваяка ў касьцеле сьв. Мікалая ў Вільні адпраўлена жалобнае набажэнства.

Зборка працаўнікоў над чысьцінёй беларускага языка адбылася апошнім разам 2 г. м., а наступная адбудзецца 16 V. а гадзіне 7 увечары ў залі Бел. Інстытуту Гаспадаркі і Культуры ў Вільні — Завальная 1—1.

З выдавецкае нівы. Нядаўна выйшла з друку і прадаецца ў беларускіх кнігарнях: „*Kazka ab rybaku i rybcy*“ *V. A.* — кніжыца для дзяцей з ілюстрацыямі, зьместу казкі. Выдавецтва Ст. Глякоўскага і Я. Найдзюка, цана — 25 грашэй.

Kanferencyja bałtyckich dziaržaŭ.

U pačatku h. m-ca ŭ Koŭnie adbyłasia čarhowaja narada pradstaŭnikoŭ Łatwii, Litwy i Estonii. Dyplomaty hetych dziaržaŭ abhawarywali sprawy supolnaj biaśpieki i ahułam sprawy henych bałtyckich dziaržaŭ u eŭrapejskaj palitycy.

Dziaržawy hetyja ŭ sich hetych sprawach wystupajuć na mižnarodnaj arenie supolna i zhodna.

Hety raz Lejba byŭ wielmi niezdawoleny sam z sibie i łajaŭ siabie całuju darohu. Da jaho na woz ścierabiŭsia ŭ Murawancy zawałacki kawal Irša i ŭściahnuŭ z saboj kuplenaje nowaje kawadła i dwa ciažkija małaty, a ŭ darozie skazaŭ Lejbie, što bolš nie zapłacić, jak załatoŭku (15 kapiejak).

— Uj, mišugin jon! — kazaŭ Lejba: — adno kawadła budzie dwa pudy, a małaty — jašče pud: razam try pudy — heta cały nowy čaławiek! Ale i ja mišugin! na što ja jaho braŭ? treba było z jaho ŭziać dwa złoty, a jon daje adzin złoty; dy jašče zbuntawaŭ mnie druhich pasažyraŭ i jany dajuć tolki pa złoty. Uj, a kłogien a dajne kopf! Ja pajdu — wyhaniu jaho z waza: niachaj lezie sam u bałota. Aŭf majne munes — wyhaniu!

Tut Lejba adwiarnuŭsia, kab pačakać na swaju furmanku, katoraja adstała ad jaho na dziesiatak sažniaŭ, až jakraz uwidzeŭ Wincusia.

—A, Jakubionak! — zahamaniŭ Lejba, zabyŭšysia ab swajej sprečcy z Iršam: — jak maješsia? kudy idzieš? u Zawałaku? Čamu ty nia jechaŭ sa mnoj? Nu, ja jašče mahu ciabie ŭziać: miejsca budzie; zapłaciš załatoŭku, abo — ty mały — dyk i hryŭni dosyć budzie, i budzieš jechać, jak pan. Jak nia maješ, ja pačakaju — pośle matka addaść: jana sprawiadliwaja kabieta — nikoli nikomu ničoha nia skruciła. Nu, siadaj! Tprrru-u!

— Dziakuj! — kazaŭ Wincuś: — ja nie pajedu: mnie niama času; treba śpiašacca ŭ Zawałaku.

— Nu, i čaho ty takoj paroj idzieš damoŭ? Ciapier jakraz treba wučycca i nima nijakaha świata, a ty idzieš damoŭ? Što heta takoje?

Wincuś ahulna raskazaŭ Lejbie ab usim.

— Nu, što? — kazaŭ Lejba: — treba było iści ŭ cerkwu. Wialikaja biada? usioroŭna wiera — takaja, ci hetkaja... aby tolki ty byŭ dobry čaławiek. Nu, što — niapraŭdu ja kažu, herst?

— Kali wiera ŭsioroŭna, — skazaŭ Wincuś, — dyk čamu, Lejba, nie achryściššia i čamu sam nia jdzieš u niadzielu ŭ cerkwu, abo ŭ kaścioł, a chodziš u swaju synagogu?... A wot naša katalickaja wiera samaja najlepšaja z całaha świetu!

— Nu, kali ty tak kažaš, dyk ty music budzieš ksiandzom, — kazaŭ Lejba i ŭważna z pad šapki pahladzieŭ na Wincusia.

— A pamojmu, — kazaŭ jon, padumaŭšy: — dla žydoŭ samaja najlepšaja žydoŭskaja wiera, dla ruskich — ruskaja, a dla polskich — polskaja. Nu, i tak niachaj kožny trymajecca: na što pieramieniać? Adny iduć u kaścioł, druhija ŭ cerkwu, a my ŭ swaja synagogu. Herst?

— A kudy my pojdziem, — pytaŭsia Wincuś, — kali my nie palaki, a biełarusy?

— Uj, što ty haworyš? Biełarusy?.. a jakaja waša wiera?

— Katalickaja!

— Nu, nu!... — kazaŭ Lejba: — ja ŭžo pastareŭ, a ad ciabie małoha pačuŭ niešta nowaje. Jak heta moža być?..

— Heta ničoha, što ja mały, ale ja wučusia, — skazaŭ Wincuś, kiŭnuŭ Lejbie haławoj i paśpiašyŭ u darohu.

A Lejba reštu dumak dahawarywaŭ sam sabie i wielmi dziwawaŭsia.

— Kali wy biełarusy, dyk u was pawinna być wiera biełaruskaja... a tut niejak wychodzić nia tak... Kožny ludź maje swaja wiera: ruski—ruskaja, a žydy — žydoŭskaja, a biełarusy?... Nu, nu! Uj, jaki ciapier chitry narod na świecie! Zatoje ciapier trudna zarabić biednamu čaławieku: kožny mišugin — Irša — ciabie ašukaje. I ŭžo ciapier stary čaławiek mienš umieje ad małoha dziciaci. Music mnie prydziecca ŭžo skora pamirać: a ja ŭžo stary... mnie bolš jak šeśćdziesiat... Uj, uj, uj!

Lejba krepka ŭzdychnuŭ i tak zadumaŭsia, što doŭha jšoŭ ściežkaj, apuściŭšy haławu i hawaryŭ z saboju; užo ciapier nie swaryŭsia, ale žaleŭ sam siabie i čuć nie zapłakaŭ, — až raptam uzdryhnuŭ, pačuŭšy zdaloku swajo imia. Heta kryčaŭ „mišugin“ Irša, wysunuŭšy z budy haławu. Akazałasia, što Lejba, zadumaŭšysia, daloka apieradziŭ swajho kania, a koń, nia čujučy haspadara, jak zahraz u hłybiejšym bałocie, dyk nie chacieŭ wyciahiwać furmanki. Tut usie dumki Lejby z mistyšnych stali praktyčnymi: jon z krykam i z puhaj kinuŭsia nie na kania, a na taho samaha Iršu i pačaŭ wyhaniać jaho z budy, i chacieŭ wykinuć jahonaje žaleza ŭ bałota. Ale i ŭ Iršy jazyk nia byŭ prywiazany, dyk padniaŭsia taki harmidar, što až recha išło pa bałocie. Druhija pasažyry trymali staranu to Lejby, to Iršy, ale nareščie, skryčaŭšysia da potu, stali pakrysie skłaniacca na Lejbawu staranu i biedny Irša, astaŭšysia adzin, nareščie zdaŭsia i abiacaŭ Lejbie zapłacić dwaccać kapiejak. A koń, apuściŭšy swaju łysuju haławu, dumaŭ swaju konskuju dumku i ciažka ŭzdychaŭ, bo jašče astawałasia paławina darohi.

Tymčasam Wincuś pajšoŭ rezwa napierad i kala paŭdnia byŭ užo ŭ Zawałacy.

Ab dziaržaŭnaj haspadarcy ŭ Polščy.

Na zborcy Polskaha Narodnaha Abjednańnia, jakaja adbyłasia 28 krasawika sioł., pasoł Rymar (endek) pračytaŭ referat ab polskaj dziaržaŭnaj haspadarcy.

Pawodle referatu pasła Rymara apisanaha ŭ „Dz. Wil.“ (Nr 118—1935), polskaje dziaržaŭnaje haspadarawańnie pradstaŭlajecca, mienš-bolš, hetak: Polskaja dziaržaŭnaja haspadarka apošnija hady maje stały deficyt — bolš raschodu, jak prychodu: u 1930-31 budžetnym hodzie — 61 miljon zł. deficytu; 1931—32 h. — 225 miljonaŭ zł. pieraraschodu; 1932-33 h. — 313 miljon. zł. niedaboru; 1933-34 h.— 337 miljon.; u 1934-35 h. — 236 mil. U pieršyja paŭhodki biahučaha 1935-36 h. pradbačycca deficyt kala 150 miljonaŭ zł.

Da hetych sumaŭ dadajucca daŭhi — daŭniejšyja i sučasnyja pazyčak. Dziaržaŭnyja daŭhi dasiahajuć miljarda zł.

Z hetakimi woś pieraraschodami wiałasia dasiul polskaja dziaržaŭnaja haspadarka. Pasoł Rymar ćwierdzić, što hety razhon u raschodawańni dziaržaŭnych hrošaj pakazuje na haspadarku pa-nad mahčymaść — „žycie nad stan.“

Пісьмы з вёскі.

— **Кастыкі**, Вялейскага пав. У каго што, а ў нас авантуры на царкоўным пагосьце. Нашыя царкоўнікі мяняюць сьвяшчэньнікамі і ня могуць натрапіць на свайго. Быў у нас сьвяшчэньнік добры чалавек — знаў мэдыцыну, дык памагаў людзям у хваробе, —выправілі. Маем надта заядлага дзячка, які па царкве і каля царквы надта шустра ўвіваецца. Трэба, каб у нашай царкве чутна была родная беларуская мова, а то ўсё яшчэ прыпамінаецца даўнейшы царскі маскоўскі лад. Для нас беларусаў таксама не свая польшчына, а сьвяшчэньнік паслушна пяе ў царкве на 3 май „Boże coś Polska.“ Нам трэба, каб сьвяшч. гаварыў пропаведзі і агулам да народу пабеларуску, а дзяк —каб вучыў хор і пяяў на кліросе беларускія рэлігійныя песьні.

Культурнае жыцьцё ў нас у заняпадзе. У вёсках шырыцца распуста. Чужая (польская) школа, польскія „стшэльцы“ і іншыя „стоважышэні“ памагаюць нашаму жыцьцю, як кашаль калацьцю.

Прав.

— **Задубеньне**, Крывіцкай вол., Вялейскага пав. Дня 28 IV-35 мясцовы Гурток Т.Б.Ш. зладзіў беларускі спэктакль, у праграму якога ўвайшла пастаноўка п‘ес: „Паўлінка“ і „Мікітаў лапаць,“ а пасьля — скокі. Нягледзячы на паганае надвор‘е, пуня, у якой было прадстаўленьне, шчыльна запоўнілася гледачамі. Адыгралі спэктакль надзвычайна ўдала. Яскрава можна было ўгледзіць вялікія здольнасьці ў вясковых артыстаў.

Самае-ж важнае, што трэба адзначыць, гэта захоўваньне моладзі падчас спэктаклю і ў часе скокаў. Было яно ідэальнае. Адчувалася вялікая ахвярнасьць і салідарнасьць. Паміма сьвяткоў — ні сьледу п‘яных. Нават курцоў ня было відаць. Лунаў здаровы, бадзёры беларускі дух. Дык слава табе Задубенская моладзь!

Будслаўскі.

— **Палачаны**, Маладэчанскага пав. Чытаў я ўважна артыкулы ў „Бел. Крыніцы“ аб абнаўленьні БХД. Добра, што гэта партыя абнаўляецца і добрыя спатыкаў праекты новай праграмы. Адно мне не падабаецца, што нехта выступіў проціў назову „Беларуская Працоўная Грамада.“ Мне здаецца гэты назоў найлепшы. Але гэтую справу вырашыць зьезд партыі.

Жывецца ў нас ня з мёдам — падаткі, шараваркі вялікія, заработкаў няма, прадаць таксама няма чаго; у дабавак бывае частавата і штрафок набяжыць — то за каня ня ўкелзанага, то за сьвіню, што рые, бывае за сабаку непрывязанага і інш. „праступкі“.

Палачанскі.

— **Lachawičy**, Baranawickaha paw. Da 1931 hodu i naša miastečka naležała da wiaskowaj wołaści. Ciapier u nas jošć mahistrat. Ziemlaroby — žychary miesta — spraciŭlalisia naležać u mahistrat, ale ničoha nie pamahło. Ziemlarobam horš u mahistracie, jak było ŭ wołaści,—treba płacić šmat bolšyja padatki. Našyja ziemlaroby ŭ 1933 hodzie staralisia wiarnucca ŭ wołaść, kab uciačy z mahistratu, —pasyłali dziela hetaha delehataŭ da pawietawaha starasty i pisali ŭ Waršawu da premjera ŭradu, ale ničoha nie dabilisia.

Miestačkowyja ziemlaroby majuć mnoha šarawarku, tak što i adrabić trudna. Sekwestratary zyskiwajuć padatki, chodziačy pa 3—4, redka pa 2. Apisywajuć i zabirajuć usio, što tolki možna ŭziać.

Ludzi abiadnieli. Da mnohich i sekwestratary nie zachodziać. U nas utwaryłasia pahaworka, jakaja abaznačaje poŭnaje abiadnieńnie, — „da jaho ŭžo i sekwestratary nie zachodziać.“

Užo da mnohich „sekwetratar“ nie zachodziać.“ Čaj.

— **Harmanawičy**, Dziśnienskaha paw. Ciažka žywiecca sialanam, i što hod, to ŭsio ciažej. Padatki zyskiwajuć niemiłaserna; sekwestratar bywaje ŭ sialanskaj chacie nadta časta, jaho znajuć nawat małyja dzieci. Za ŭsio treba płacić i ŭsio treba kuplać, a sielaninu za pud aŭsa płaciać tolki 1 zł. 50 hr. Jeduć ad nas na zarabotki ŭ Łatwiju, ale j tudy nia ŭsim dastupna.

Nawat i świaščeńnik, katory biełarusam słowa Božaha pabiełarusku nia skaža, i toj trebuje ad biełaruskich sialan składki. A na što? — Musić na ruskuju hazetu „Słowo“, što maskali wydajuć u Waršawie. Parachwijanie nia lubiać świaščeńnika i padawali niekalki prośbaŭ u Konsystoryju, kab jaho źmianili. Ale heta ničoha nie pamahaje, — dyk ludzi pierastajuć chadzić u carkwu.

Słowam, puścieje carkwa, i kali hety świaščeńnik budzie dalej, apuścieje zusim. Čyt.

— **Гарадышча**, Баранавіцкага пав. Коопэрацыя мае вялікае значэньне: яна гуртуе людзей і гэткім спосабам робіць тое, чаго ўпаасобку людзі зрабіць ня могуць. У нас праз коопэрацыю польскія асаднікі хацелі рабіць сваю — польскую работу. Ад 1925 году існуе ў нас „Каса Стэфчыка.“ Залажылі яе асаднікі. Беларусаў прымалі дзеля паёў. За 10 гадоў „Каса“ ані аднаму сябру-пайшчыку ня ўпісала ў кніжку ані грошыка процанту. У канцы аказалася, што на кожны пай прыпадае каля 10 злот. страты. Адкуль узялася страта?— З неразумнай гаспадаркі! — Рабілі расходы большыя, чымся мелі даходаў. Словам, жылі над стан, як і у сябе дома жывуць асаднікі, а дзеля таго, што „Каса“ не атрымлівае запамогі з казны, як даставалі яе асаднікі, дык у „Касе“ і страта.

У 1931 годзе з „рабра“асадніцкай „Касы Стэфчыка“ паўстала ў нас малачарня. Тады, хто пазычаў у „Касе“ грошы, той даваў і пай ў малачарню, ня гледзячы на тое, ці яна, малачарня, была яму карыснай ці зусім чужой. Многія гэткія сябры малачарні жылі на сваіх гаспадарках больш як 10—15 кілямэтраў ад малачарні. Пагаспадарылі ў малачарні асаднікі толькі 3 гады— у 1934 годзе малачарня зьліквідавалася, бо не дасатавала запамогі з казны, як даставалі асадніцкія гаспадаркі. За няўмелае гаспадараваньне ў малачарні „культуртрэгераў,“ сялянам, што давалі з гора пай, трэба яшчэ дабавіць, каб пакрыць страты з коштамі праўнай ліквідацыі. Вот, як разьвіваецца коопэратыўная гаспадарка ў руках чужынцаў, якія ня ведаюць ані патрэбаў нашага Краю ані жыцьця нашых людзей. Коопэрацыя ня любіць палітыкі — на беларускіх землях коопэрацыя павінна быць беларускай.

Пасьля банкруцтва асадніцкай—польскай коопэрацыі мы ставім ясныя дамаганьні — *дайце магчымасьць развою нашай, беларускай коопэрацыі, якая патрапіць падняць культурна-коопэратыўны ровень роднай вёскі.*

Ранд.

Roznyja wiestki.

Выясьнілася! З апошняга нумару „Роднага Краю“ даведываемся, што на чале фактычна неіснуючага „Цэнтральнага Беларускага Праваслаўнага Камітэту“ стаіць *У. Більдзюкевіч.* Цяпер усё ясна і ўсё зразумела! А гэты „Ц Б.Прав.К.“ аб‘яднаўся *з праваслаўным* Р. Астроўскім і кумпаніяй.

Незайздроснае іхняе „*праваслаўе*“! Дзякуй Богу, што яно ня шырыцца ў беларускім народзе!

З пісанінай „Ц.Б.П.К.“ спрачацца ня будзем, бо там ад пачатку да канца манлівае ляпятаньне.

З ЦАРКОЎНАГА ПАГОСТУ.

Сьвяткаваньне 3 мая Сёлета польскае народнае сьвята 3 траўня (Констытуцыя 3 мая) праваслаўная царква ў Польшчы сьвяткавала ўрачыста. Па загаду Мітрапаліта Дзяніса ва ўсіх сьвятынях адпраўлены былі ўрачыстыя багаслужэньні і пяялі песьню „Boże coś Polskę“.

Скасавалі эвангелію пабеларуску. Традыцыйна ў пасхальнае сьвята ў Праваслаўнай Царкве сьпявалася многамоўна эвангеліе. У віленскім саборы сьв. Духа летась, залетась, агулам раней, пяялі эвангелію і *пабеларуску.*

Сёлета *пабеларуску* эвангелію ўжо не пяялі.

Ці не рэзультат гэта супрацоўніцтва Астроўска-Більдзюкевічавага *праваслаўнага* аб‘яднаньня з віленскімі „царкоўнікамі“ з пляцу сьв. Гэлены?

Цьвёрдыя цэны. Сьв. Сынод Праваслаўнай Царквы ў Польшчы разам з польскім міністэрствам В. Р. і А. П. установіў цьвёрдыя цэны на выпісы мэтрыкаў. Кансысторыі за копію мэтрыкі могуць браць да 12 зл. і да 5 зл. за выпіску з мэтрыкі; парахвіі — за копію да 5 зл., а за выпіску да 3 зл. Гэтыя цэны не абымаюць вартасьці стэмплёвай аплаты. За гэта трэба асобна плаціць.

Z HAZET.

Wodhuk sawiecka - francuskaha dahaworu. Hetymi dniami Sawiety zaklučyli z Francyjaj dahawor ab uzajemnaj dapamozie ŭ wypadku wajny. Francuskija hazety, pišučy ab hetym dahawory, ćwierdziać, što sawiecka-francuski sajuz nakirawany praciŭ Niamieččyny.

Anhielskija hazety dakazywajuć, što hety dahawor tolki demonstracyjny, bo jon tak napisany, što Sawiety ad Francyi pomačy ŭ wajnie nie dačakajucca.

Ab kałhasnaj haspadarcy ŭ Sawietach i „čynopočytanije“. Balšawickaja hazeta „Prawda“ piša: — U Stalinhradzkim rajonie polnyja raboty spoźnieny... — rašyli nahnać nočami. Na kałhasnym poli mała ludziej, usie pracujuć u swaich harodčykach, jakija kałhaśnikam pazwolena mieć pry chacie. Karespandent hazety ćwierdzić: — U adnym kałhasie na 570 hektaraŭ sieŭnaj płoščy zasiejena tolki 138 h. Usie try traktary mašyna-traktarnaj stancyi stajać. Daŭno stajać? — pytaje karespandent. — Ad rana.—Čamu? — My cełuju noč siejali — adkazwaje bryhadir (staršy rabotnik—ciwun), dyk treba addychnuć.

Zrazumieła. Chto pracuje ŭnočy, toj dniom musić addychać.

A woś abrazok z siała Chabnoč na sawieckim Paleśsi, dzie zarhanizawana h. zw. „świnahadoŭla“. Ab hadoŭli świniej u hetaj „świnahadoŭli“ karespandent „Prawdy“ piša hetak:

„Darma dyrektar świnarniku Kučenik dakazywaŭ, što ŭ 1934 hodzie ŭ jaho było ŭsio ŭparadku. U hetym hodzie zhinuła 20—25 prac. parasiat. Parasiata hinuli z hoładu i chaładu. Rabotniki hetaha świnarniku nie dastajuć chleba — prywoziać im z kolektyŭnaj stałoŭki tolki redkaje baćwińnie.

U kolektywach bywaje i hetak: Hazeta „Prawda“ piša, što

„ŭ Wierchniestuinskim kamunistyčnym świnarniku, u Krasnouralskim rajonie, dyrektar taje świnahadoŭli Černich zahadywaŭ rabotnicy Wotinawaj, kab karmiła małych parasiat swaimi hrudźmi“.

Heta prypaminaje rymskich niawolnikaŭ, ciełam katorych karmili rybu.

Druhaja scena. U Tatarskaj respublicy nad Wołhaj jošć miastečka Buhulec. U henaje m-ka majuć pryjechać sawieckija dastojniki z Kazani:

„Zastupnik sekratara rajonnaha kamitetu Bołataŭ wycirajučy z łobu zimny pot — wydaŭ nahły prykaz— „pawodle hieneralnaj linii partyi“ — ŭparadkawać miastečka! Wyčyścić pamieščańni ŭstanowaŭ i nikoha tudy nia ŭpuščać, kab nie naświnili. Prybrać wulicy transparentami i plakatami. Usie pryhažejšyja budynki aświetlić. Zamknuć na kluč usie karowy, świni, sabaki i inšyja źwiarata“.

Dastojniki pamiaściacca ŭ miestačkowym hoteli. Dziela hetaha: „usie inšyja hości z hotelu — won!

Z usich ustanoŭ źwieźli ŭ hotel lepšyja mebli i ŭsio, čym možna prybrać kwateru, i prawiali ŭ hotel telefon“.

Ci nia toje samaje, a moža jašče i horšaje, carskaje „čynopočytanije?“

„Pasoł da Boha“. Hetak nazywajecca nowaja paukrainsku napisanaja Marjama Łužnyćkim drama pra św. Jozafata. „Нова Зоря“ padaje, što 6 h. m. jaje stawili ŭ Lwoŭskim teatry, u jakoj wystupaje 120 asob artystaŭ.

Nastroi polskaha siała. Hazeta „Piast“ piša: — Kab sialanie pačuli, što končyłasia sanacyja i ŭžo niama jaje, — była-b ahulnaja radaść.

Z POLŠČY.

Sioletnija školnyja feryi. U siarednich i pačatkawych školach letnija školnyja feryi buduć ad 20 červienia da 3 wieraśnia.

Karfanty pad sudom. Prakuratura patrebawała ad maršałka Senatu wydačy sudu senatara W. Karfantaha, katoraha winawaciać za abman na sumu 18.000 zł.

Z ZAHRANICY.

Tworčy fašyzm. U Italii byli wialikija abšary bałota. Urad Musoliniaha hetyja bałoty asušyŭ i ŭžo na asušanym abšary pastrojeny 3 harady, a pole — wielmi ŭradžajnaje.

Prociŭkamunistyčny teror u Sawietach. Niadaŭna ŭ Sawietach tajkom zastreleny 3 kamunisty. Balšawickija ŭłady šukajučy winawatych natrapili na prociŭkamunistyčnyja tajnyja arhanizacyi.

Fabryka induskich bahoŭ u Litwie. U Koŭnie induskija artysty-reźbiary adkryli fabryku statujaŭ Buddy. U Indyi mnoha razychodzicca statujaŭ Buddy — šmat kuplajuć, a najlepš ich wyrablać z litoŭskaha dubu. Kab nie wazić u Indyju duboŭ z Litwy, u Koŭnie wyrablajuć statui.

Śpieka. U ŭschodnia-paŭdzionnaj Rasiei trywaje ciapier strašennaja śpieka,—ad 20 da 40 hradusaŭ. Zbližajecca jana i da našych ziemlaŭ.

Z WILNI.

Chulihanskija pastupki. U noču z 3 na 4 h. m. niazłoŭlenyja chulihany pazdymali i zabrali šyldy biełaruskich instytucyjaŭ, jakija mieściacca pry wul. Zawalnaj 1.

Treba adznačyć, što heta nia pieršy pastupak chulihanaŭ: śpiarša hetyja šyldy byli pachilanyja na ścianie; letaś niejki chulihan parezaŭ nažom karespandencyjnuju skrynku pry dźwiaroch, a miesiac tamu hetu skrynku ŭkraŭ.

Kraža dziela materjalnaha zysku tut wyklučajecca.

Redaktar Jan Paźniak. Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny ŭ Wilni, Zawalnaja 1 — 2. Wydawiec A. Šutowič